


# Гродзенскі Універсітэт

ГАЗЕТА ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

*№ 3 (243) 1 красавіка 1997 года, аўторак*


## ЗАКЛІКІ

### ЦК ПАРТЫІ АМАТАРАЎ СМЕХУ ДА 1 КРАСАВІКА – МІЖНАРОДНАГА ДНЯ СМЕХУ

Завочнікі і завочніцы! Памятайце, што завочна вучыцца - усё роўна, што завочна абедаць!

Студэнты! Умейце слухаць! Ніколі не перабівайце прафесара, калі ён вас хваліць!

Выкладчыкі! Умейце растлумачыць студэнтам, што ў іх поспехах ёсць і ваша львіная доля!

Выкладчык! Сачы за сваёй мовай! Памятай, што акрамя "значыць" і "так сказаць" яна павінна мець і іншыя выразы!

Студэнты і аспіранты! Дамагайцеся, каб вас лічылі перспектыўнымі! Тады да вас будуць паблажліва адносіцца ўжо сёння!

Выкладчыкі! Шануйце свой аўтарытэт! Не ведаючы адказу на пытанне, адсылайце студэнта, які яго задаў, куды далей!

Выкладчыкі! Разбудзіце ў студэнтах думку, нават калі яны, слухаючы вас, паснулі!

Студэнты! Будзьце адкрытымі! Прама кажыце аб сваёй згодзе з выкладчыкам!

Студэнты! Смейцеся сёння, бо заўтра можа быць не да смеху!

Чытачы! Не крыўдуйце на жарт! Лепш вазьміце жартаўніка на заметку!




Мал. М. Паршыкава.

## ЦИТАТА НОМЕРА:

***"Кто никуда не плывет, для тех не бывает попутного ветра".***

***М. Монтень.***

## ФИЛОСОФИЯ: НА ПЕРЕЛОМЕ ЭПОХ



О философии сегодня любят поспорить все, кому не лень. Появился даже такой термин: философствовать. И немногие задумываются, что же стоит за этим понятием. Какие-то жизненно важные основы или просто изящная словесность? И все же люди, владеющие хотя бы основами философии, смотрят на мир иначе, чем те, кто далек от нее.

***Наши интервью***

Наш разговор сегодня - с заведующим кафедрой философии, доктором философских наук, профессором **Ч.С. Кирвелем**. Кстати, те, кто знаком с Чеславом Станиславовичем, наверное, знают и его спокойный характер, и мудрое, рассудительное отношение ко всему происходящему. А повод к разговору - его новая работа по философии, которая вот-вот увидит свет.

**- Чеслав Станиславович, Ваше мировоззрение - это и есть философское отношение к жизни? Это - тот отпечаток, который накладывает профессия?**

- Несомненно, философия повлияла на формирование характера. Хотя, конечно, я и по жизни такой, спокойный. А философией заняться мечтал еще в школе. Родился и вырос в Щучинском районе, казалось бы, какая там философия? Но... поступил в ЛГУ на философский факультет, затем - в аспирантуру. Защитил кандидатскую диссертацию. Затем - Комсомольск-на-Амуре, где преподавал в политехническом институте. Хорошая жизненная школа, накопление опыта. Так что, когда вернулся на родину в 1980 году, имел уже определенный багаж знаний, опыт работы и тот отпечаток, который накладывает философия на каждого, кто ее изучает. Докторскую защищал уже в 1990 году.

**- А как Вы понимаете предназначение философии, ее роль в жизни общества, в подготовке специалистов?**

- Отношение к философии в известной мере является показателем зрелости и отдельного человека, и общества. И если специалисты, считающие себя

**(Окончание на 5 стр.)**

## ВІНШАВАЛЬНАЯ ПАШТОЎКА

*ВІНШУЕМ НАШЫХ ЮБІЛЯРАЎ І НАГАДВАЕМ, КАЛІ І КАГО МОЖНА ПАВІНШАВАЦЬ З НАГОДЫ ЮБІЛЕЮ.*

1 красавіка - Вольгу Станіславаўну *БАРЫСАВУ* - лабаранта 1 катэгорыі кафедры замежных моў.

4 красавіка - Уладзіміра Уладзіміравіча *МАРШАЛКА* - рабочага.

7 красавіка - Мікалая Мікалаевіча *БАБАРЫКА* - старшага выкладчыка кафедры матаналізу.

15 красавіка - Алега Міхайлавіча *БАЯРКІНА* - загадчыка кафедры тэарэтычнай фізікі.

16 красавіка - Людмілу Яўгенаўну *БАЛАШОВУ* - лабаранта 1 катэгорыі кафедры гісторыі славянскіх дзяржаў.

18 красавіка - Рому Раманаўну *ПРАКОП'ЕВУ* - дацэнта кафедры педагогікі і методыкі пачатковага навучання.

24 красавіка - Людмілу Георгіеўну *АРЛЮК* - касцяляншу інтэрната №2.

28 красавіка - Віктара Ільіча *РАЗЯПКІНА* - дацэнта кафедры біяхіміі і біятэхналогіі.

28 красавіка - Людмілу Васільеўну *ПАНЬКОВУ* - лабаранта 1 катэгорыі кафедры матаналізу.



## Афіцыйна

# НА САВЕЦЕ УНІВЕРСІТЭТА

На лютаўскім пасяджэнні Савета універсітэта было разгледжана некалькі найбольш важных надзённых пытанняў. Асобным пунктам на парадку дня Савета стаяла пытанне "Аб асноўных напрамках і перспектывах развіцця навучальна-метадычнай працы ва універсітэце". Начальнік навучальна-метадычнага аддзела дацэнт Т.А. Бадзюкова ў сваім выступленні паведаміла аб стане навучальна-метадычнай працы, расказала аб перспектывах яе развіцця. Час не стаіць на месцы, патрэбны новыя формы і метады работы. І калектыў шукае і знаходзіць тое, што патрэбна менавіта сёння.

Была заслухана таксама справаздача галоўнага бухгалтара Т.А. Герашчанка аб выкананні каштарысу расходаў за мінулы год.

Прайшло таксама выбранне па конкурсу.

У раздзеле "рознае" былі абмеркаваны пытанні аб зацвярджэнні тэмаў дысертацый, аб размеркаванні сродкаў, выдзеленых Міністэрствам адукацыі для фінансавання навукова-даследчых працаў, аб удасканаленні сістэмы платных паслуг, аб зацвярджэнні навучальных праграм і іншыя надзённыя пытанні.

# АБМЕРКАВАНА РЭКТАРАТАМ

На пасяджэнні рэктарата 3 сакавіка былі разгледжаны пытанні падрыхтоўкі да універсітэцкай атэстацыі. Аб выніках праверкі стану справаводства на факультэтах і кафедрах паведамілі дэканы матэматычнага факультэта Т.Э. Можджэр, замежных моў - Л.В. Рычкова, фізічнай культуры - У.М. Карчэўскі, намеснікі дэканаў факультэтаў права і эканомікі В.В. Каленікаў, філалагічнага - П.Л. Навіцкі.

Падвяла вынікі работы па падрыхтоўцы да атэстацыі начальнік навучальна-метадычнага аддзела Т.А. Бадзюкова.

- Скончылася праверка, ці, дакладней, самаатэстацыя, - зазначыла Таццяна Аляксееўна. - Мы паглядзелі на сябе як бы з боку, убачылі, над чым трэба працаваць, дзе прыкласці больш намаганняў. Тыя пяць факультэтаў, якія камісія правярала апошнімі, выглядаюць лепш за тыя, з каго пачыналася праверка. Бо ўжо былі ўлічаны памылкі і недахопы.

Лепш наладжаны справы на факультэце фізічнай культуры. Тут абагульняецца вопыт лепшых трэніровак, запісваецца на відэакасеты. Сур'ёзных заўваг няма па вядзенні дакументацыі на кафедры беларускай мовы філалагічнага факультэта, на кафедрах рускай, нямецкай і раманскай моў факультэта замежных моў.

Члены рэктарата пагадзіліся на тым, што да 15 сакавіка парадак будзе наведзены, усе недахопы па вядзенні дакументацыі будуць выпраўлены.

* * *

На пасяджэнні рэктарата ад 17 сакавіка былі абмеркаваны вынікі зімовай экзаменацыйнай сесіі. З інфармацыяй па гэтым пытанні выступіў прарэктар па навучальнай рабоце прафесар І.П. Мартынаў.

- Гэтая сесія, - зазначыў дакладчык, - прайшла больш паспяхова, чым год таму. Сярэдняя паспяховасць па універсітэту склала 83,3 працэнты сярод студэнтаў бюджэтнага аддзялення і 82,9 - сярод платнікаў. Больш высокія паказчыкі ў вучобе паказалі студэнты факультэта педагогікі і псіхалогіі. Напрыклад, на аддзяленні псіхалогіі паспяховасць склала 100 працэнтаў. Добрыя вынікі на факультэтах гісторыі і культуры, права і эканомікі.

Менш на сёлетняй сесіі і адлічэнняў. Калі ў мінулым годзе па выніках зімовай экзаменацыйнай сесіі "адсеяліся" 62 студэнты, то цяпер - 21, і 4 - за нез'яўленне на сесію.

Было таксама разгледжана пытанне аб арганізацыі музея гісторыі універсітэта. Інфармацыю падрыхтаваў дэкан факультэта гісторыі і культуры прафесар І.П. Крэнь. Ён прапанаваў канкрэтна, што неабходна зрабіць, з чаго пачынаць, каб, нарэшце, стварыць такі музей, падрыхтаваў і праект загаду, які і быў вынесены на абмеркаванне.

У раздзеле "рознае" было разгледжана пытанне аб складанні эксперыментальнай праграмы па курсу "Асновы медыцынскіх ведаў. Валеалогія".

# АДКРЫТАЯ РАЗМОВА

**А. ГРЫНЬ,**
**дэлегат Кангрэса грамадскіх арганізацый Расіі і Беларусі**

У мінулым месяцы ў Маскве праходзіў Кангрэс грамадскіх арганізацый Расіі і Беларусі. Ініцыятарам яго правядзення была расійская асацыяцыя культурных і эканамічных сувязяў з Рэспублікай Беларусь. Мэта - падтрымка інтэграцыйных працэсаў нашых рэспублік на грамадскім узроўні.

Форум прайшоў на адзіным дыханні, адчувалася, што ў прысутных як з расійскага, так і з беларускага бакоў - адкрытасць, гатоўнасць да больш цеснага супрацоўніцтва.

Беларускую дэлегацыю сустрэлі на пероне. Там ужо чакалі два аўтобусы, якія і даставілі нас у Савет Федэрацыі, дзе ў зале прэс-цэнтра праходзіў гэты форум.

Пасланне прэзідэнта Расійскай Федэрацыі Барыса Ельцына Кангрэсу зачытаў расійскі віцэ-прэм'ер Сяроў. Зацікаўленымі былі выступленні мэраў горада Масквы - Лужкова, Мінска - Ярмошына, беларускага прэм'ера Русакевіча, міністра па справах садружнасці Тулеева. Шмат было канкрэтных прапаноў.

У кожнага, хто выступаў на гэтым сходзе - а такіх было каля пятнаццаці чалавек - былі свае думкі наконт інтэграцыі, многія выказвалі пажаданні ад імя партый, канфесій і арганізацый, якія прадстаўлялі. А ў выніку атрымалася размова аб тым, што набалела, што патрэбна ў хуткім часе вырашаць. Вядома, чуліся настальгічныя ноткі аб мінулым, калі мы ўсе жылі ў адзінай магутнай краіне. Але час дыктуе свае падыходы, двойчы ў адну раку ўвайсці немагчыма. Трэба шукаць выйсце, аказваць падтрымку кіраўнікам абедзвюх дзяржаў - вырашылі на сходзе.

Удзельнікі Кангрэса прынялі зварот да народаў Расіі і Беларусі, да Прэзідэнтаў і Урадаў, Парламентаў і грамадскіх арганізацый дзвюх краін.

У ім гаворыцца, што наша багацейшая гісторыя, блізкія мовы і культуры, гераічныя і працоўныя традыцыі, трывога за заўтрашні дзень заклікаюць да аб'яднання. Кангрэс заклікае ўсіх жыхароў Расіі і Беларусі асэнсаваць простую, але крайне важную думку: разам лягчэй і больш надзейна будаваць дабрабыт. Наша аб'яднанне, цеснае супрацоўніцтва і дружба - гэта жыццёвая неабходнасць.

У звароце ўдзельнікі Кангрэса звяртаюцца канкрэтна і да моладзі, чыё юнацтва праходзіць у перыяд цяжкага гістарычнага пералому.

- Вы з'яўляецеся сведкамі беспрэцэдэнтных падзей у некалі дружных, стабільна развіваючыхся рэспубліках былога СССР, - гаворыцца ў звароце. - Не давайце ўцягнуць сябе ў палітычныя разборкі, зрабіцца зброяй чыёйсьці злой волі. Вам давядзецца з асколкаў збіраць нашу славянскую супольнасць, будаваць адзіную дзяржаву, выводзячы народы з апатыі і нявер'я.

# СЕМИНАР МАТЕМАТИКОВ

На математическом факультете продолжает работу семинар "Математическая наука и образование" (руководители - профессор И.П. Мартынов, профессор А.А. Пекарский, доцент Ю.П. Золотухин). Его очередное заседание было полностью отдано гостям.

Сначала перед участниками семинара выступили заведующий кафедрой методики преподавания математики Могилевского педагогического института, доцент Л.А. Лаготин и доцент кафедры алгебры и геометрии того же института Б.Д. Чеботаревский. Они рассказали о научных и методических особенностях своего учебника "Математика-5", который в настоящее время проходит экспертизу на кафедре алгебры, геометрии и методики преподавания математики нашего университета.

Потом выступил с сообщением заместитель декана механико-математического факультета БГУ, доцент кафедры геометрии, топологии и методики преподавания математики В.В. Суворов. Он познакомил присутствующих с концепцией, структурой и содержанием модернизированного курса "Аналитическая геометрия". Этот курс, отличающийся высоким уровнем абстрактности и основанный на использовании теоретико-множественного и группового подходов, разработан для студентов специальности "математика".

Оба сообщения были выслушаны присутствующими с большим вниманием и вызвали интерес. Гостям пришлось ответить на многочисленные вопросы. Высказанные в ходе дискуссии замечания и конструктивные предложения были приняты ими с благодарностью. В выступлениях участников семинара в целом была дана высокая оценка проделанной работы. В заключение всем гостям были вручены сувениры в память о пребывании в Гродненском университете.

**А. БОТИС,**
**секретарь семинара.**



# У РАКУРСЕ - БУДУЧЫЯ ПСІХОЛАГІ



**Аддзяленне псіхалогіі факультэта педагогікі бадай самае маладое ва універсітэце: яму ўсяго тры гады. Яшчэ толькі напрацоўваецца вопыт, набіраецца размах у падрыхтоўцы такіх неабходных у наш імклівы час спецыялістаў. А ўжо вызначыўся свой почырк, свой творчы падыход у Гродзенскай псіхалагічнай школы, якую ўзначальвае доктар псіхалагічных навук, прафесар С.В. Кандрацьева. Яна, дарэчы, з'яўляецца яшчэ і сапраўдным акадэмікам Расійскай Акадэміі педагагічных і сацыялагічных навук.**

**Рыхтуюць кадры па дзвюх спецыяльнасцях: псіхалогія развіцця і юрыдычная псіхалогія. Спецыялізацыя пачынаецца на трэцім курсе. Тут пакуль што тры курсы, якія налічваюць 126 студэнтаў. На трэцім курсе - 31 чалавек, у тым ліку 8 "платнікаў", на другім - 28, усе на дзяржбюджэце, а на першым курсе ўжо - 57 студэнтаў, у тым ліку 14 - на платнай аснове. Дарэчы, можна заўважыць, як год ад году расце цікавасць да гэтай прафесіі, як павялічваецца набор.**

**Як жыве кафедра, чым цікавяцца, чым захапляюцца студэнты? Аб чым мараць будучыя псіхолагі? Якія яны?**

**Сёння госці нашай рэдакцыі - студэнты другога курса кафедры псіхалогіі Наталля Хільмановіч і Канстанцін Карпінскі. Гэта - выдатнікі, як кажуць, "зоркі". І не толькі на сваім курсе, а і на аддзяленні, ва універсітэце.**



## DO YOU SPEAK ENGLISH?

**- Косця, ці ёсць у псіхолагаў агульныя інтарэсы?**

- Я хацеў бы пачаць расказ з таго, як жыве наш курс. Калі мы сустрэліся ўпершыню, адчулі, што нас нешта аб'ядноўвае, прыцягвае. Хлопцаў на курсе ўсяго чатыры. Астатнія - дзяўчаты. Але ўсе ў школе былі калі не выдатнікамі, то з адной - дзвюма "чацвёркамі". Адным словам, эліта. Прайшоў месяц - другі - пачалі аб'ядноўвацца. Ведаеце, што ў нас добра атрымалася? Нашы канцэрты. Мы арганізавалі вечарыну "Прысвячэнне ў першакурснікі", потым выступілі яшчэ і яшчэ. Творчы калектыў стварыўся як бы сам сабою. Назваць яго вырашылі "Інсайт" - азарэнне.

Цяпер у "Інсайта" - свая праграма, свой стыль.

У складзе "Інсайта" - 15 чалавек. Людзі з самымі align рознабаковымі інтарэсамі і захапленнямі. А разам мы - творчы калектыў. Выступалі нядаўна ў рамках адборачнага конкурса "Студэнцкая вясна - 97". Апладысментаў было шмат, але першае месца прысудзілі, на жаль, не нам.

**- Косця, раскажы пра сябе падрабязней: што робіш асабіста ты, чым цікавішся?**

- Я пішу сцэнарыі для нашага "Інсайта". Наогул, лічу, што я не памыліўся ў выбары. Яшчэ ў школе пачаў задумвацца аб псіхалогіі. Вучыўся ў звычайнай сярэдняй школе №24, скончыў яе з залатым медалём, выходзіў пераможцам абласных алімпіяд па біялогіі. Дарэчы, я спачатку хацеў стаць біёлагам, але неяк адразу адчуў, што гэта - не маё. Яшчэ на кафедры абслугоўваю камп'ютар. Маю пасведчанне праграміста, якое атрымаў у вучэбна-вытворчым камбінаце пасля заканчэння трохгадовых курсаў.

**- Ці ёсць у цябе захапленне?**

- Ёсць: англійская мова. Пры факультэце замежных моў існуе англійскі клуб, я з вялікай ахвотай наведваю яго. Там вельмі цікава: святы англійскія і амерыканскія адзначаем, а заадно вывучаем традыцыі, мову. Размаўляем жа між сабой толькі на англійскай мове. Там жа - бібліятэка, дзе можна ўзяць кнігу, чытаць не пераклады, а першакрыніцы на мове туманнага Альбіёна.

**- Як ты ўяўляеш сваю будучыню? Прафесія псіхолага - гэта назаўсёды?**

- Што тут можна сказаць? Ва ўсялякім выпадку, надоўга. Псіхолагі патрэбны ў розных сферах - школе, установах МВД, рэкламе, бізнесе. Я неяк чытаў рэкламу ў газеце "Известия". Увагу прыцягнула такая аб'ява: патрабуецца вядучы менеджэр з веданнем псіхалогіі. У сферы кіравання таксама неабходна быць крыху псіхолагам. А калі ты яшчэ і дыпламаваны спецыяліст - гэта ж цудоўна!

**Наш кар.**

**На здымку: студэнт 2 курса аддзялення псіхалогіі Косця КАРПІНСКІ.**
**Фота Ул. САРОКІНА.**

## ЗАЎТРАШНІ ДЗЕНЬ — ЗА НАМІ

Я лічу, што аддзяленне псіхалогіі, наш курс - самыя лепшыя ва універсітэце ці адны з лепшых. Чаму? Нават вынікі зімовай сесіі гавораць аб гэтым. З 28 чалавек больш палавіны здалі на "выдатна". Такой адзнакі, як "здавальняюча", у нас зусім няма. Не прызнаем.

На кафедры выкарыстоўваецца вопыт лепшых псіхолагаў, асабліва - традыцыі Ананьеўскай школы універсітэта Санкт-Пецярбурга. А падтрымлівае гэтую традыцыю і стварае сваю, гродзенскую псіхалагічную школу, загадчык кафедры С.В. Кандрацьева.

Я лічу, што будучыня - за прафесіяй псіхолага. Выбрала спецыяльнасць невыпадкова. Вучылася ў сярэдняй школе №32 г. Гродна. Хацела стаць псіхолагам. Вельмі ўзрадавалася, што ў нас ёсць такое аддзяленне, і не трэба нікуды ехаць вучыцца. Яшчэ ў школе задумвалася аб унутраным свеце чалавека, аб тым, што называюць душой. У нейкім сэнсе лічыла, што кожны чалавек - крыху псіхолаг. Без пэўнага запасу псіхалагічных ведаў і вопыту немагчыма жыць у грамадстве. Мы ж з дзяцінства распазнаем настрой людзей, асаблівасці іх характару. Жыццёвую псіхалогію назапашвае кожны. Але гэта толькі ілюзія ведаў. Шмат тонкасцяў і асаблівасцяў утойвае навука псіхалогія. Напрыклад, возьмем простае: як адрозніваюцца пачуцці ад адчуванняў? Напэўна, не кожны адкажа правільна.

Тым і цікавая псіхалогія, што мы пазнаем шмат новага аб, здавалася б, звычайных, звыклых рэчах і паняццях. Вось і вучацца тыя, хто абраў прафесію, за якой будучыня, на "добра" і "выдатна". На першым курсе ў нас было 25 выдатнікаў. Цяпер -крыху менш. Але я не бяруся сказаць, што цікавасць да заняткаў у некаторых знізілася. Гэта не так. Проста стала складаней. Вучыцца амаль што няма дзе. Мы займаемся ў корпусе на вул. Даватара ў розныя змены. Літаратуры па псіхалогіі цяпер шмат, але яна вельмі дарагая. У бібліятэках стараемся перахапіць. Хачу сказаць вялікае "дзякуй" нашым выкладчыкам. Яны прыносяць ксеракопіі кніг, якія ёсць у адзіным экземпляры. Як правіла, гэта найбольш папулярныя, цікавыя і змястоўныя падручнікі.

**Н. ХІЛЬМАНОВІЧ,**
**студэнтка 2 курса.**

**На здымку: Наташа ХІЛЬМАНОВІЧ.**
**Фота Ул. САРОКІНА.**



*Анонс*

# ВЫШЛИ В СВЕТ

В первом квартале 1997 года в издательском отделе вышло и готовится к изданию более 20 учебных и методических пособий. Вот краткая справка о некоторых из них.

**Всеобщая история**. Учебно-методические разработки для слушателей отделения доуниверситетской подготовки. В 2-х частях. Часть 1. - История советского общества. Издание 2-е.

**Всеобщая история**. Учебно-методические разработки для слушателей отделения доуниверситетской подготовки. В 2-х частях. Часть 2. - Новейшая история. Издание 2-е.

**Ковкель И.И. История Беларуси**. Учебное пособие по истории Беларуси для слушателей отделения доуниверситетской подготовки. В 2-х частях. Часть 1. - С древнейших времен до 1863 года и часть 2 - с 1861 до 1917 года.

**Высшая математика**. Учебно-методическое пособие по одноименному курсу для студентов экономических специальностей.

**Методы коммерческих и финансовых расчетов**. Практикум по курсу "Финансы, кредит и модели инвестиций" для студентов специальности "Экономическая кибернетика". В 3-х частях. Часть 1. - Простейшие методы финансовых вычислений.

**Основные методы финансового анализа инвестиционных проектов**. Практическое пособие по финансовому анализу инвестиционных проектов для студентов специальностей "Экономическая кибернетика", "Международные экономические отношения".

**Тексты для чтения на английском языке**. Для студентов специальности "Правоведение".

**Человек и его материальные потребности**. Тематический словарь. Учебное наглядное пособие по практике устной речи для студентов специальности "Английский язык и современные иностранные языки".

*В порядке обсуждения*

# ШКОЛА ВЫЖИВАНИЯ

**Время требует от каждого из нас конкретных действий: Для того, чтобы не просто выжить, а и упрочить свое положение, устоять на ветрах перемен, необходимо предпринимать правильные шаги. Какие? Давайте думать и искать вместе.**

**В порядке обсуждения мы публикуем сегодня статьи начальника отдела зарубежных связей, маркетинга и права И.Б. Захарченко и заместителя декана факультета права и экономики Ли Чон Ку.**

**Просим Вас, уважаемые читатели, откликнуться на проблемы, затронутые сегодня, поделиться своими мыслями, идеями по улучшению финансового положения университета.**

## *ГЕНЕРАЦИЯ ДОХОДОВ*

**И. ЗАХАРЧЕНКО,**
**начальник отдела зарубежных связей, маркетинга и права**

Сегодня сокращение государственного финансирования высшего образования - это распространенное во всем мире явление, реакцией на которое стал выход многих университетов мира на рынок в качестве самостоятельных предпринимателей.

В последние годы в международных образовательных кругах появился термин "генерация доходов" (Income Generation). Причиной появления нового термина явилось повсеместное снижение бюджетного финансирования сферы высшего образования и настоятельное выталкивание университетов на рынок для поиска альтернативных источников доходов.

Генерация доходов - это процесс получения дополнительных финансовых ресурсов из источников, отличных от базового финансирования.

Генерация доходов включает в себя деятельность вуза по обучению студентов, оплачивающих свое образование из внебюджетных источников, осуществление хозрасчетной консультационной и образовательной деятельности, эксплуатацию резервов недвижимости и оборудования, а также исследования, финансируемые из альтернативных источников.

Университет Варвика, партнер нашего университета по проекту Темпус Тасис "Инфраструктура регионального университета-предпринимателя", получает в процентном отношении почти в два раза больше бюджетного финансирования, чем любые другие университеты, государственное финансирование которых сокращается год от года. Почему?

Варвик вознаграждается за демонстрацию гибкости и чуткости к потребностям региональной промышленности и торговли, за объем и разнообразие видов деятельности, генерирующих доход. Кроме того, Варвик инвестирует свой доход преимущественно в научные исследования. И это получило мировое признание в виде престижного Приза Карла Бертелсманна (Carl Bertelsmann Prize) "за образцовую комбинацию академического превосходства и предпринимательства" и вывело его на один уровень с Кембриджем и Оксфордом по характеру и качеству научных исследований. Газета Таймс назвала его "наиболее инновационным учреждением высшего образования в Британии", а бывший председатель группы Ровер (Rover Group) сэр Грэхэм Дэй (Sir Graham Day) сказал: "Если бы не было Университета Варвика, группе Ровер пришлось бы его изобрести".

Нынешнее белорусское правительство, конечно, если оно неравнодушно к громким успехам своей политики, должно перенять важный и действенный принцип "Давать тем, кто лучше", особенно если правительство заботится о том, чтобы об успехах его политики было широко известно.

Этот принцип работает не только в образовании, точно также происходит и в реальной жизни. Жалобы на бедность и финансовые затруднения означают только то, что ваши ресурсы будут сокращаться и впредь. А успех порождает успех.

# РЫНОК ТРУДА: НОВЫЕ ПОДХОДЫ

**Ли Чон Ку,**
**профессор,**
**заместитель декана факультета права и экономики по подготовке экономических кадров**

Экономические, социальные и политические процессы, происходящие в Республике Беларусь, повлекли ряд изменений во многих сферах жизни населения. Наряду с позитивными моментами существует и множество отрицательных явлений. Среди них - снижение уровня социальной защищенности молодого поколения, и в частности - студентов.

Появились проблемы трудоустройства. На данный момент сложилась критическая ситуация с поиском работы по специальности у выпускников вузов. Ранее эта проблема была не столь острой, так как существовала государственная система распределения, которая давала возможность получить первоначальное место работы.

В связи с этим разработан проект Гродненского комитета AIESEC при Гродненском госуниверситете, который направлен на защиту прав молодого специалиста на достойную работу, на развитие и укрепление связей с деловыми кругами региона. Коротко о самом комитете. Гродненский Комитет AIESEC является подразделением крупнейшей международной некоммерческой неполитической ассоциации AIESEC, объединяющей более 50000 студентов и молодых специалистов в области экономики и управления из 80 стран мира.

Основные направления - программа стажировок ITEP. Эта программа дает возможность студентам получить практический опыт работы на настоящем предприятии в одной из стран-членов AIESEC; глобальная тематическая программа: на 4 года выбирается тема, по которой в течение этого периода проводятся семинары, конференции во всех комитетах AIESEC; сотрудничество с фирмами, предприятиями, компаниями. Ассоциация предлагает широкий спектр услуг экономического характера: организация выставок-продаж, семинаров, научных конференций, презентаций, маркетинговые исследования рынка и т.д.

С момента регистрации Гродненским Комитетом AIESEC уже был проведен ряд мероприятий. Это - организация совместно с общественным объединением "Новый век" семинара "Первый шаг. Как организовать свой бизнес", который проходил в г. Гродно 20-22 марта прошлого года, это и организация самостоятельного проекта "Рынок труда. Выпускник МЭО-96" для первых выпускников кафедры Международных экономических отношений.

Именно успешное проведение этого мероприятия в рамках одной кафедры послужило идеей для организации такого же проекта для всего университета.

Какие цели и задачи проекта? Главное, пожалуй, - привлечь внимание общественности к проблеме трудоустройства молодежи, а также содействовать развитию цивилизованного рынка труда, способствовать налаживанию контактов между работодателями и молодыми специалистами.

Разработаны концепция, рабочий план. Кстати, многие пункты его уже выполняются.

# ФИЛОСОФИЯ: НА ПЕРЕЛОМЕ ЭПОХ

**(Начало на 1 стр.)**

интеллигентами, не приемлют философию, то это свидетельствует о деградации интеллигенции. Философия преподается во всем мире. При этом диплом без оценки по философии на международном рынке интеллектуального труда неконвертируем. Такое внимание к социогуманитарным и философским дисциплинам не случайно. Как в прошлом, так и в настоящем, все фундаментальные открытия свершались людьми универсально образованными, прекрасно ориентирующимися в общей социальной картине мира, а также в искусстве, музыке, истории и т.д. Прав был Г. Лихтенберг, когда говорил: "Кто не понимает ничего, кроме химии, тот и ее понимает недостаточно". И по сей день огромное количество технических вузов "штампует" узких специалистов, деятельность которых замыкается на каком-то локальном участке или направлении. Отсюда - частичный человек, человек-функция, профессиональный идиот, у которого, в силу его объективного положения, формируется психология "винтика".

Характерно, что в переломные моменты развития общества, как, например, сегодня, интерес к философии резко возрастает. В эти периоды происходят серьезные сдвиги в системе ценностей. Человек начинает нуждаться в ответах на вопросы: как жить? В чем смысл жизни? Для чего я живу? Что я такое на этой земле? Что есть добро и зло? и т.д. В этой ситуации хочешь - не хочешь - станешь философом.

**- В этой связи что предпринимает ваша кафедра для обновления и совершенствования курса философии?**

- По мере изменения ситуации в нашем обществе философия обретает то место и положение, которое присуще ей в интегральном процессе духовного развития человечества. Мы говорим о принципиальном изменении подхода к преподаванию курса философии.

Коллектив кафедры философии разработал принципиально новую программу и планы семинарских занятий курса философии, которые, как представляется, приближены к современным мировым стандартам. Но главное - кафедра приступила к изданию новых учебников и учебных пособий по курсу философии. В декабре 1994 года вышел в свет курс лекций "Асновы філасофіі", подготовленный коллективом кафедры, тиражом 4 тысячи экземпляров. Учебник очень быстро был распродан, только библиотеки г. Минска заказали более 1,5 тысяч экземпляров. К настоящему времени подготовлен макет нового учебника "Уводзіны ў гісторыю філасофіі". Осталось его только тиражировать.

**- Не могли бы Вы более подробно рассказать о содержании и специфике учебника "Асновы філасофіі?" В частности, как внедряется в учебный процесс, какие он получил отзывы?**

- Данный учебник - это первая попытка изложить курс истории философии на белорусском языке. В процессе его подготовки решалась задача адаптации сложной философской терминологии к специфике белорусского произношения и написания. Учебник подготовлен с учетом последних достижений философской науки. В него включены многие новые для учебной литературы проблемы и аспекты, вытекающие из анализа поведения неравновесных систем, затрагивающие истоки и природу человеческой активности, раскрывающие нелинейность и многовариантность общественного развития, высвечивающие характер детерминации настоящих социальных событий будущим и т.д. Учебник активно используется студентами, что не только позволяет им познакомиться с новейшими философскими проблемами и учениями, но и способствует изучению и укоренению белорусского языка в студенческой среде. Именно поэтому мы и издали "Асновы філасофіі" на белорусском. Язык будет усваиваться студентами как бы исподволь, и пользы будет больше, чем от шумихи, лозунгов и митингов по этому поводу.

Вообще рассматриваем выход в свет данного учебника и подготовку к изданию учебника по истории философии как общекультурное явление в Республике Беларусь. Об этом свидетельствуют и отзывы в постановлении комиссии Верховного Совета Республики Беларусь по образованию, культуре и сохранению исторического наследия от 4 октября 1995 г., отмечается своевременность и значительность этой работы. В "Вестнике Белорусского университета" №2 за 1996 г, серия 3 опубликована рецензия специалистов - кандидата философских наук доцента И.Ф. Габруся и доктора социологических наук, профессора К.М. Кунцевича из Минска. Они отмечают содержательность и фундаментальность учебника, полезность его широкому кругу читателей, как преподавателей, так и студентов.

**- Все труды Ваши направлены на подготовку молодых специалистов, будущего нации. Не секрет, в последние годы молодежь изменилась. Каков он, нынешний студент?**

- Несомненно, не тот, что был двадцать или десять лет назад. К сожалению, преобладают в молодежной среде потребительские настроения. Если все будут подходить к жизни с потребительскими взглядами, будущее этого поколения сомнительно. К сожалению, все начинается в семье.

**- Как Вы относитесь к религии, вере в Бога?**

- В переходные моменты люди всегда обращались к Богу. С точки же зрения Канта, можно доказать как наличие, так и отсутствие Бога. Однако религия несет социальные функции, она нужна. Жизнь на земле никогда не была устроена, всегда были боль, обида, разочарование и попытка найти какую-то опору за пределами. И этой опорой была вера, религия, которая снимала психологическое напряжение. Отработаны ритуалы, которые помогают в трудную минуту. Например, человек верит, что ему будет дано загробное воздаяние, и он умирает спокойно. Одна из сегодняшних наших бед - это и то, что дети не прошли религиозное воспитание. Они не знают, что можно, чего нельзя. "Если Бога нет, то все позволено", - еще Достоевский сказал. И это так же плохо, как и то, что дети лишены национальных сказок. Исчезли эти сказки, песни, детские умы заполонили боевики и триллеры.

**- Время от времени слышатся ностальгические вздохи о прошедшем. А в работе со студентами Вы ориентируетесь больше на прошлое, настоящее или на будущее?**

- Человек устроен так, что память удерживает больше положительных моментов. Вот о них и вздыхаем, молодость ведь была у каждого. Для нас надежда означает гораздо больше, чем обладание. Поэтому студентов, конечно, ориентирую на будущее.

**Записала Л. ДАНИЛОВА.**



**Кароткім радком**

## ПЕРШАЕ МЕСЦА

У пачатку года Федэрацыя прафсаюзаў Рэспублікі Беларусь абʼявіла конкурс на лепшую эмблему Федэрацыі. У гэтым конкурсе прымалі ўдзел і студэнты аддзялення мастацтваў факультэта педагогікі і псіхалогіі. Асабліва не разлічвалі на поспех, і таму такой радаснай і нечаканай была вестка: студэнтка II курса аддзялення мастацтваў Святлана Ціхамірава заняла першае месца ў конкурсе.

Святлана - член студэнцкага прафсаюзнага камітэта, акрамя вучобы працуе мастаком у газеце "Маладзёжны курʼер". Як ёй удалося выйсці на першае месца? Відаць, невыпадкова. Света падрыхтавала сем варыянтаў эмблемы...

## ДОБРА, АЛЕ МАЛА

У бягучым навучальным годзе студэнцкаму прафкаму было выдзелена чатыры санаторна-курортных пуцёўкі ў санаторыі "Лётцы", "Палессе", імя Леніна. Усе яны разлічаны на 24 дні аздараўлення. Каб аказаць дапамогу ўсім, каму трэба падлячыцца, трэба было б, вядома, значна больш пуцёвак. Нам прыйшлося разбіваць адну пуцёўку на дзве - па 12 дзён, такім чынам папраўлялі здароўе двое.

Студэнту трэба было даплаціць 10 працэнтаў кошту пуцёўкі, астатняе ўзяў на сябе прафсаюз. Адпачывалі і лячыліся студэнты Ж. Шніпко з аддзялення псіхалогіі, Т. Габышава з факультэта права і эканомікі, А. Наско з факультэта замежных моў.

Закупілі мы таксама 41 абанемент у плавальны басейн фізкультурна-аздараўленчага камбіната, таксама размеркавалі паміж студэнтамі. Але, на жаль, усіх жадаючых забяспечыць пуцёўкамі і абанементамі проста немагчыма.

**А. ГРЫНЬ,**
**старшыня студэнцкага прафкама.**



**Жыццё студэнцкае**

## ДНІ МАТФАКА

Стала добрай традыцыяй праводзіць Дні матфака. Звычайна гэтыя дні чакаюць усе, бо матфакаўцы запрашаюць на свае свята і студэнтаў з іншых факультэтаў.

Так было і на гэты раз. У першы дзень - а гэта была серада - студэнцкі клуб матэматыкаў паказаў праграму "Пытанне рабром або...". У 13 гадзін тыя, хто зацікавіўся, сабраліся ў актавай зале. Праграма была разлічана, скажам так, не на прастакоў. А тыя, хто мае творчую жылку, знаходлівасць, засталіся задаволенымі.

У 15.30 у аўдыторыі працаваў відэаклуб, а ў 17 гадзін зноў жа ў актавай зале адбылося прысвячэнне першакурснікаў у студэнты. Такі быў дзень першы.

На другі дзень пасля заняткаў матэматыкі прапанавалі "Кактэйль гульняў" для выкладчыкаў і студэнтаў "Хто на што здатны". Пасля зноў - відэаклуб, дзе можна было паглядзець лепшыя фільмы года. А вечарам можна было паслухаць бардаўскія песні.

Дзень трэці, бадай, запомніўся ўсім: матфак-шоу падрыхтавала праграму "Студэнцкі каламбур", якая была паказана ў Доме афіцэраў. А пасля - дыскатэка, бар.

## "СТУДЭНЦКАЯ ВЯСНА - 97"

Пад такой назвай праходзіў адборачны конкурс мастацкай самадзейнасці студэнцкіх творчых калектываў. Чатыры вечары запар у актавай зале гучалі музыка, песні, жарты: вясна ёсць вясна. Гледачы сустракалі кожнае выступленне апладысментамі, смехам, выказваючы яўныя сімпатыі таму ці іншаму калектыву.

Журы, справядлівае і бесстароннае, вызначыла лепшых. У фінал конкурса выйшлі творчыя калектывы аддзялення мастацтваў факультэта педагогікі і псіхалогіі, матэматычнага, фізіка-тэхнічнага і факультэта гісторыі і культуры.

На жаль, не прадставілі на конкурс сваіх самадзейных артыстаў факультэты філалогіі і біялогіі і экалогіі.

Наогул жа конкурс "Студэнцкая вясна-97" стаў не толькі аглядам творчых сілаў, але і сапраўдным святам песні, жарту, своеасаблівым экзаменам на творчы пошук і самабытнасць.

**Люди науки**

# ТЕРНИСТЫЙ ПУТЬ В ГОРУ

Гость нашей редакции - доктор физико-математических наук, заведующий кафедрой теоретической физики Олег Михайлович Бояркин.

Думаем, нашим читателям будет интересно взглянуть на человека науки как бы другими глазами, попытаться увидеть за научными достижениями ту "изюминку", которая есть, конечно, в каждом.

**- Как начинался Ваш путь в науку?**

- Учился я в одном из старейших вузов страны, в Днепропетровском университете. Это были 60-е годы. Физика элементарных частиц состояла из необозримого набора конкурирующих друг с другом теорий. Только к концу 70-х было завершено создание теории, которая легла в основу современной физики элементарных частиц. Эта теория была так математически безукоризненна, что Шведская Академия Наук присудила Нобелевскую премию ее создателям С. Вайнбергу, Ш. Глэшоу и А. Саламу, не дожидаясь подтверждения теории экспериментом. Мы знаем только их имена, а имен тех, кто искал и не нашел правильного решения, теперь уже не вспомнит никто. Среди последних был мой учитель проф. А. Боргардт. У него я писал курсовую и дипломную работы, а затем и кандидатскую диссертацию. И все они были посвящены одной и той же теме, а именно - физике электромагнитных и слабых взаимодействий.

**- В прошлом году Вы защитили докторскую диссертацию. Не могли бы Вы рассказать нам о каком-нибудь результате Вашей работы?**

- Существует так называемая проблема солнечных нейтрино. Вкратце ее сущность в следующем. В центральной части Солнца за счет ядерных реакций рождается огромное количество нейтрино. Этот нейтринный поток оказывается сильно уменьшенным, когда мы регистрируем его земными детекторами. Единственное логическое объяснение этой загадки - это механизм конверсии нейтрино в другие частицы. Существующие ранее теории великолепно описывали уменьшение потока солнечных нейтрино, однако при этом вступали в противоречие с другими экспериментальными фактами. Я нашел решение проблемы солнечных нейтрино, свободное от указанных недостатков.

**- Собираетесь ли Вы продолжать свою научную работу? Где теперь лежит круг Ваших интересов?**

- В фундаменте современной физики микромира есть один кирпичик, так называемый бозон Хиггса. Ни одно даже самое богатое воображение не в состоянии предсказать, какой станет физика, если эта частица не существует в реальности. Бозон Хиггса до сих пор не открыт, хотя его ищут на всех ускорителях мира вот уже в течение 17 лет. Однако прежде, чем ставить дорогостоящие эксперименты, мы должны определить их возможности, т.е., указать, какой из них может быстрее привести к цели. Буквально несколько дней назад мы отправили в журнал статью, в которой показали, в каких реакциях по косвенным эффектам можно зарегистрировать бозоны Хиггса. Шестимесячная работа над статьей финансировалась Международной Соровской Программой Образования в области точных наук.

**- Есть ли у Вас хобби?**

- Наука - очень тяжелый труд. И Вы не добьетесь никаких результатов, если не будете сильны духом и телом. Можно полностью уйти в науку или всецело жить искусством и спортом - эти подходы к жизни одинаково правомерны, хотя взятые по отдельности и неполны. Именно взятые вместе они и дают нам полное представление о мире. Истинная наука сродни искусству, и я не раз находил правильное решение очередной проблемы, слушая своих любимых композиторов: Баха, Моцарта и Вивальди. Я никогда не отступал от намеченных в своей научной работе целей, как бы они ни были трудны, потому что еще с детства моим любимым героем был герой из книги Д. Лондона "Время не ждет". Мои любимые виды спорта связаны с горами. Свой последний пятитысячник (пик Черлениса) я взял в 1989 г. Горные лыжи, на которых я съезжал с Чигета и Эльбруса, еще в полном порядке.

**- Скажите, какое место в Вашей жизни занимает наш город?**

- Собственно, все мое детство и часть юности связаны с Гродно. Здесь я прочитал свою первую книгу, узнал и полюбил таинственный мир музыки, впервые переступил порог спортзала и, наконец, самое основное, выбрал физику элементарных частиц как основную цель своей жизни. В этом городе я закончил школу и вернулся в него только спустя 17 лет.

**- Что Вы любите в этой непростой жизни?**

- Я люблю все настоящее. Мой девиз - лучше ничего, чем подделка. Истинной наукой можно называть лишь только ту часть человеческих знаний, которая изучает основы мироздания. И служение именно ей принесет Вам истинное удовлетворение. В отношении спорта замечу, что ощущения, которые испытываешь, играя в настольный теннис, никак не могут сравниться с тем чувством, каким полон горнолыжник, входящий в поворот на скорости 60 км/ч. И, наконец, боюсь, что вдохновения от шедевров Ф. Киркорова не хватит для решения задачки по тригонометрии.

**Наш корр.**

**Міжнародныя сувязі**

# НАШЫ Ў ЗША

Фонд Сораса ўжо другі год праводзіць конкурс сярод работнікаў бібліятэк вну. Пераможцы гэтага конкурса атрымлівають права стажыроўкі ў ЗША. У мінулым годзе такое права заваявала мінчанка. А сёлета - прадстаўніца нашага універсітэта, загадчыца кабінета замежных моў Тамара Цімафееўна Матвеенка.

12 чалавек з краін Усходняй Еўропы сталі пераможцамі сорасаўскага конкурса, і зараз яны - у Амерыцы. Наша прадстаўніца працуе ў бібліятэцы кангрэса ЗША. Мы, калегі, нядаўна атрымалі ад яе ліст. Тамара Цімафееўна піша, што вывучае Internet у бібліятэчнай справе, камп'ютарызацыю. Вельмі стамляецца: хочацца ахапіць як мага больш. Бібліятэка кангрэса - гэта тры гмахі. Адзін будынак - старадаўні, прыгожай архітэктуры. А два - звычайныя бетонныя каробкі, як і ў нас.

" - Тут усё цалкам аўтаматызавана, - піша Т.Ц. Матвеенка. - Стаяць тысячы камп'ютараў. Картачных каталогаў, як у нас, даўно ўжо няма. Наогул уражанне ад Вашынгтона добрае. Цэнтр горада вельмі прыгожы і самабытны. А жылыя раёны, ці, як іх тут называюць, спальныя, такія ж, як і ў нас: таксама можна збіць абцасікі. Пасля стажыроўкі ў бібліятэцы кангрэса ў праграме - работа ў Ілінойскім універсітэце..."

Тэрмін замежнай камандзіроўкі нашай калегі - тры месяцы. Так што ўсю вясну яна правядзе за акіянам. А як вернецца, спадзяемся, паведае нашым чытачам аб Амерыцы больш падрабязна.

**Л. ЛІМАР,**
**бібліятэкар І катэгорыі.**



# "Наднёманскія галасы": НОВЫЯ ІМЁНЫ

## БУДЗЕМ ЗНАЁМЫ: Дзяніс ТРУСАЎ



**Ён прыйшоў у рэдакцыю з машынапісная нізкай вершаў. На тытульнай старонцы было напісана: "Сборник "Провинция". Высокі, хударлявы, аскетычнага складу, гэты юнак пакідаў двоякае ўражанне: на першы погляд здаваўся вымучаным, змарнелым. А калі сказаў адну-дзве фразы - адчулася, што ён - не чалавек з натоўпу, не шэрасць, не звычайная пасрэднасць, а творчая асоба, якая заўсёды ў пошуку. Можа, на яго абліччы адбіваецца бяссонная ноч, калі паэт у пошуку Слова не змыкае вачэй. Можа, на яго твары - мукі і самота некалькіх пакаленняў, якія шукалі і не знаходзілі, верылі і памыляліся, гублялі і аплаквалі, спадзяваліся і кахалі...**

**Так, паэтамі не становяцца, паэтамі нараджаюцца. Магчыма, лёс абраў менавіта яго.**

**У Дзяніса Трусава ўсё яшчэ наперадзе: і непаўторная вясна, якая бывае ў жыцці кожнага, і расчараванне, боль і радасць адкрыцця, і каханне, і, вядома, вершы. Верыцца, што тыя радкі, якія напісаў Дзяніс, невыпадковыя, што працяг абавязкова будзе...**

**Д. Трусаў - студэнт 2 курса факультэта замежных моў. Вучыцца на платным аддзяленні. Англійская мова - яго захапленне з дзяцінства - стане прафесіяй. Марыць аб рабоце школьнага настаўніка. Сам жа вучыўся ў сярэдняй школе N 10 з паглыбленым вывучэннем англійскай мовы.**

**Любіць чытаць. Піша вершы, у асноўным - "белыя", у авангардным стылі, без знакаў прыпынку. Фармуе з іх тэматычныя зборнічкі і... раздае напамяць сябрам. Супрацоўнічае з газетай "Маладзёжны кур'ер" - піша вершы, невялікія апавяданні.**

**Дзяніс - адзіны сын у бацькоў, звычайных працавітых людзей: маці - электрык, бацька - гісторык. Уплыў на яго творчасць ідзе не з сям'і, не з школы. Само жыццё з яго рэаліямі знаходзіць водгук у душы. Выносім на ваш суд, шаноўныя чытачы, першую падборку вершаў Д. Трусава - споведзь яго душы.**

*Л. ДАНІЛАВА,*
*рэдактар газеты "Гродзенскі універсітэт".*

### БЫТЬ ИЛИ НЕ БЫТЬ?

Быть или не быть?
Посмотри на часы.
Тебе осталось пять минут.
Оглянись назад.
Ты увидишь свет -
Свет той звезды, что давно не
светит тебе.
И в бульварной толпе
На гулянье планет
Она - Арлекино,
Она - циркач,
И три толстяка аплодируют
ей,
Но гимнаст Тибул не натянул
канат.
Ее пластика-чудо,
Ее растяжка хороша.
Их бычьи глаза оценят это,
Но ты - никогда.
Ты хотел быть первым,
Но остался в стороне,
А звезда ушла в цирк,
Больше не веря тебе.

* * *

Дарили мне море
И сушу,
Дарили звезды,
И месяц тоже.
В картонной коробочке
Несчастную душу
Дарил мне когда-то
Есенин Сережа.
Дарили мне попусту
И безвозвратно,
Дарили оптом, дарили,
Не глядя.
Теперь я смогу подарить
Всем подарок -
Засну и умру,
Когда солнце сядет.

* * *

Как птица, что летит в небе,
И как добрый мохнатый олень,
Я родился, чтоб быть
свободным -
Веселиться и петь целый день...
Как машина, что рада
техслужбе,
Как чиновник, спешащий в
контору,
Я родился, чтоб быть
несвободным,
Обойди стороной мою нору.

* * *

Я в немилости у здешнего
бога -
Он ангиною давит меня,
Он невесел в сухую погоду,
Он дождем бьет меня, не щадя.
Из-за каждой знакомой
калитки
Он дворнягой осипшей лает.
Я хочу отсюда уехать,
Только он меня не пускает.

* * *

Такой детский секрет:
В песочнице
Под бутылочным
Стеклышком спрятаны
Два фантика и ромашка.
Я знаю секрет, я решил
посмотреть
На него,
И раскопал стеклышко,
Но вместо цветка и фантиков
Я увидел чей-то мертвый глаз.

* * *

Никто не помнит об ушедшем
свете,
Кормившем попадающих
впросак,
А помнит кто-нибудь зеленый
ветер,
Танцующий в сиреневых
кустах?
И солнце, встав, позолотило
окна,
И фонари, погаснув, умерли.
И лопнула забытая лампада,
И вот теперь валяется в пыли.

* * *

Когда мне позволяют гулять
Где угодно,
Я прихожу в степь.
В степи две стихии -
Зеленое воинство трав
И суровое небо.
От этого мне легко,
Потому что проще
разобраться
В окружающем мире.
Я внимательно рассматриваю
Простор до самого горизонта,
И обычно замечаю несколько
Столбиков вдали,
К которым привязаны,
Похожие на воздушные
шарики,
Мои сны.

---

*Кароткім радком*

## АМАТАРАМ ПРЫРОДЫ

• 15 сакавіка ў актавай зале галоўнага корпуса сабраліся аматары прыроды. Тут адбыўся семінар на тэму "Рэдкія птушкі - індыкатары ўнікальнасці прыродных тэрыторый".

Праграма семінара была цікавай і шырокай: прадстаўляліся шматлікія слайд-фільмы, кіно- і відэафільмы аб самых унікальных кутках беларускай прыроды - запаведных і неахоўваемых, аб фауне гэтых мясцін.

Цікава было паслухаць паведамленні вядучых арнітолагаў і спецыялістаў па ахове прыроды аб рэдкіх і знікаючых відах птушак Еўропы і Беларусі і праблемах іх выратавання.

Семінар праводзілі энтузіясты універсітэта, факультэт біялогіі і экалогіі і Заходне-Беларускае таварыства аховы птушак пры падтрымцы спонсараў. У гэты ж дзень быў праведзены пяты з'езд Заходне-Беларускага таварыства аховы птушак.

## "КАПІТАЛ" ЗАГАРНУЦЬ?

З месяц таму на дошцы аб'яў у галоўным корпусе можна было ўбачыць аб'яву аб тым, што універсітэцкая бібліятэка па зніжанай цане прадае літаратуру: Руска-беларускі слоўнік у трох тамах, творы К. Маркса, Ф. Энгельса, У.І. Леніна.

Як паведаміла рэдакцыі загадчык аддзела бібліятэкі А.Д. Сямёнава, трохтомнікі-слоўнікі па зніжанай цане пайшлі. Прададзена 5 экземпляраў. А вось з класікамі марксізму-ленінізму "праляцелі": ні адзіны твор не прададзены. Прапаноўваліся ж чытачам дзесяцітомнікі У.І. Леніна, трох-, чатырохтомнікі К. Маркса і Ф. Энгельса.



# 1 красавіка: жартуйце разам з намі, жартуйце больш за нас!

## ФРАГМЕНТЫ

**и фрагментики пресс-конференции студентов и преподавателей, состоявшейся в один из дней матфака**

И был это день второй, и было все поставлено с ног на голову: студенты-математики задавали вопросы, а "преподы" отвечали. И ответы оценивали студенты: аплодисментами. И происходило это все в актовом зале, в главном корпусе.

Не успевали "преподы" отвечать - вопросы так и сыпались: то из микрофона в руках ведущей, то из записок из зала. Вот некоторые из них:

- Чтобы был тонкий юмор, нужны ли толстые знания?
- Знания вообще не нужны. Нужно соображение.
- Руководствуетесь ли вы правилом: если проспали, успокойте себя тем, что хорошо выспались?
- ...!?
- Весна... Звери выходят из спячки, а студенты, наоборот, впадают в нее. Как быть?
- Рассказать анекдот.
- Кому на матфаке жить хорошо?
- Студенту.
- Ваш любимый анекдот...
- Пришел студент вовремя на лекцию...
- Почему Вы решили избавиться от Вашей обворожительной бороды?
- А почему вы решили, что это я решил?
- Какой еще государственный праздник Вы бы ввели?
- Стабильный - по четвергам.
- У Вас явные способности к театральной деятельности. Не собираетесь ли Вы перейти в театр?
- Зачем переходить, когда наша жизнь - сплошной театр?
- Не посылаете ли Вы видеозаписи лекций и экзаменов в программу "Сам себе режиссер"?
- Нет. Если посылать, то надо куда подальше.
- Должен ли джентльмен, если он преподаватель, подавать леди выпавшую шпаргалку, если леди - студентка?
- После того, как поставит "пару".
- Сколько стоят персики в Европе?
- Дешевле "Памперсов", но дороже "Obi".

## ПРЫКОЛЫ

- Чаму так уздаражала жыццё?
- Таму, што яно перастала быць прадметам першай неабходнасці.

☹ 😐 ☺

- Мама, сёння дырэктар школы спытала, ці ёсць у мяне браты і сёстры, і я адказаў, што я - адзінае дзіця ў сям'і.
- І што ж яна адказала?
- Яна сказала: слава Богу!

☹ 😐 ☺

Мужчына зайшоў у краму і крычыць прадаўшчыцы:
- Запалак!
- Не крычыце так, я не глухая! Раскрычаўся тут! Вам якіх, з фільтрам ці без?

☹ 😐 ☺

- Шэйла! Ты так модна апранаешся! Колькі атрымлівае твой муж?
- Апошні раз ён атрымаў два гады і шэсць месяцаў...

☹ 😐 ☺

Лес. Муж і жонка збіраюць грыбы. Жонка знайшла вялікі белы грыб і пытаецца:
- Любы, гэтым грыбам не атруцішся?
- Пакуль ты з яго нічога не прыгатавала - не.

☹ 😐 ☺

- Збірайся, ужо канец працоўнага дня.
- А чаго збірацца: закрыю рот і пайду дамоў.

☹ 😐 ☺

- Ты не павінна была расказваць нікому.
- Але ж ты сама гаварыла: "Тайна для ўсіх". Я ўсім і расказала.

☹ 😐 ☺

- Мне не зусім спадабаўся ваш адказ, - сказаў прафесар студэнтцы.
- Гэта таму, што мне з самага пачатку не спадабалася ваша пытанне, - адказала тая.

## ИЗ НАСТОЛЬНОЙ "ЖИВОПИСИ" СТУДЕНТОВ

- Спи, студент, стране нужны здоровые специалисты.
- Не храпи, чтобы не разбудить соседа.
- Любовь приходит и уходит, а кушать хочется всегда.
- Если хочешь быть здоров, ешь один и в темноте.
- Если хочешь поработать, ляг, поспи и все пройдет.

## ФРАЗЫ

◆ Хто ёсць студэнт? Той, хто атрымлівае стыпендыю.

◆ Чарвяк сумнення: ці таго я грызу?

◆ Навошта крычаць, калі павысілі ў пасадзе, а не ў голасе...

◆ Час працаваў на нас, потым мы зрабілі яго беспрацоўным.

◆ Прасвятленне: зразумеў, што на многае лепш закрываць вочы.

◆ Усе мы плывем на адным караблі: хто ў машынным аддзяленні, хто - у рэстаране.

◆ Усё жыццё шукаў зарыты ў маладосці талент.

## У ВАС ЁСЦЬ ПРАС?

Папрасуйце электрапрасам УТ 1000-1,2.220, адпаведным ГОСТу - 307-81, абведзеную рамкай плошчу, і Вы прачытаеце першакрасавіцкі жарт. Дзецям да 16 гадоў не рэкамендуем!

## АБ'ЯЎКІ

Добра пішу сачыненні па Талстому, асабліва "Вішнёвы сад". Званіце 444-43-09.

Скіньце тут свае штаны - вынік будзе цудоўны

У хімчыстцы.

Увага, жанчыны! У ваколіцах парка з'явіўся гвалтаўнік. Праехаць да парку можна аўтобусамі 4 і 15.

## РЕКЛАМА, ОБЪЯВЛЕНИЯ

### Поздравляем!

**Наталию Петровну ДУДКО с днем рождения!**

Не все бывает в жизни гладко -
Какая роза без шипов?
Но женщина - всегда загадка,
И здесь не надо лишних слов.
Какие авторы приходят!
Труды какие день за днем!
Да, день за днем, увы, проходят,
Но стоит ли жалеть о том?
И в твой (который?) день рожденья
Хотим удачи пожелать.
Пусть будет солнышко весеннее.
Читать тебе - не уставать.
Желаем многого - помногу:
Побольше денег и друзей,
Счастливой жизненной дороги,
А рядом - преданных людей.

**Коллектив издательского отдела.**

### Шчыры дзякуй!

Мы, студэнты, якія жывуць у інтэрнаце №2, хочам сказаць добрае слова аб загадчыцы нашага інтэрната Галіне Рыгораўне Адамовіч. Яна - сапраўдная гаспадыня нашага вялікага агульнага дома, спагадлівая і чулая, памацярынску добрая і чалавечная. А студэнту, згадзіцеся, такія адносіны ой як неабходны!

Мы дзякуем Галіне Рыгораўне за чалавечнасць і спагадлівасць, зычым здароўя, шчасця, поспехаў.

**М. СЯНЬКО, В. КУЗЮК, Д. ЛІСУН і іншыя жыхары інтэрната №2 - усяго 180 подпісаў.**

### Нешуточное объявление

*Татьяна Г., с 1 апреля! Я люблю твою улыбку.* **П.**

### Крик души

*Таня, я всё простил. Позвони!* **В.**

### Музыкальные новости

*Студенческая группа* **"Lykantropia"** *выпустила свой дебютный демо-альбом под одноименным названием. Ищите!*

*Заснавальнік: Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы.*

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 519.

Газета набрана, звярстана і аддрукавана на тэхніцы выдавецкага аддзела Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы.

*Рэдактар* **Л.ДАНІЛАВА.** *Набор і вёрстка:* **М. ВЕРСТАК, П. КРЫШАЛОВІЧ**

Газета выходзіць адзін раз у месяц.
Аб'ём - 1 друк. арк.

*Здадзена ў набор 18.03.97*
*Заказ № 41*
*Наклад 500 асобнікаў.*

Аўтары надрукаваных матэрыялаў адказваюць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытатаў, эканамічных даных, асабістых іменаў, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтара.

*Наш адрас:* ✉ *г.Гродна, вул. Ажэшкі, 22, пакой 228.* ☎ *72-08-17.*